# АНСАМБЛЬ «ГАМАНІНА» (БДУІР) – ЗАХАВАЛЬНІК БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

*Дзяржаўская А.В.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Наўроцкая І.В. – старшы выкладчык*

У артыкуле прадстаўлена апісанне ансамбля народнай песні "Гаманіна", яго дзейнасці ў кантэксце захавання народнай культуры, у тым ліку праз прадстаўленне разнастайнасці дыялектаў беларускай мовы ў абрадавых песнях. Захаванне і ўзнаўленне арыгінальнага гучання песень пашырае межы ўсталяванага ўяўлення пра аспекты функцыянавання беларускай мовы, што дапамагае захаванню нацыянальных асаблівасцей і ідэнтычнасці Беларусі ў цэлым.

Захаванне традыцыйнай народнай культуры аказвае неацэнны ўплыў на фарміраванне народнай ідэнтычнасці і распаўсюджванне інфармацыі аб культурнай спадчыне нашай Радзімы. Дыялекты з'яўляюцца неад'емнай часткай беларускай культуры, паколькі менавіта яны адлюстроўваюць унікальныя рысы і асаблівасці традыцый насельніцтва самых разнастайных паселішчаў на тэрыторыі Беларусі. Як лічаць навукоўцы, вывучэнне беларускай мовы, як і любой іншай, было б няпоўным без вывучэння жывога народнага маўлення, у тым ліку і дыялектаў, якія з'яўляюцца адной з крыніц папаўнення лексікі літаратурнай мовы [1]. Акрамя таго, дыялекты ў кантэксце народна-абрадавых традыцый наглядна ілюструюць сваю разнастайнасць, што робіць вывучэнне беларускай народнай культуры заняткам не проста карысным, але і неверагодна цікавым. А ў сучасным свеце, дзе глабалізацыя і стандартызацыя становяцца ўсё больш распаўсюджанымі з'явамі, захаванне і дэманстрацыя разнастайнасці дыялектаў набывае асаблівую важнасць. Менавіта гэтым і займаецца "Гаманіна" — ансамбль народнай песні, заснаваны на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, удзельнікамі якога з'яўляюцца студэнты гэтай вну.

Зараз у складзе ансамбля больш за дзесяць чалавек, усе студэнты-першакурснікі, а таксама аркестр са шматлікімі інструментамі: скрыпкі, цымбалы, флейта, акардэон, басэтля, варган, барабаны, дуда — усе разам яны ствараюць і аднаўляюць унікальныя старажытныя мелодыі. У рэпертуары “Гаманіны” танцы, сабраныя з усіх куткоў Беларусі, у якіх улічваецца местачковая манера выканання рэгіёна – радзімы кожнага асобна ўзятага танца; тое ж самае датычыцца і песень, выбраных для выканання.

Касцюмы – асобная тэма ў размове аб ансамблі. У шырокі гардэроб ўключаны рэканструкцыі строяў розных рэгіёнаў. Яны прадстаўлены разнастайнымі рэчамі, з якіх складаюцца ўнікальныя касцюмы для кожнага з удзельнікаў: ёсць кашулі, доўгія спадніцы і сарафаны для дзяўчат і штаны для хлопцаў, камізэлькі, галаўныя ўборы, фартухі і, вядома, паясы.

Ва ўдзельнікаў ансамбля ёсць як індывідуальныя рэпетыцыі, накіраваныя на раскрыццё індывідуальнага таленту, так і групавыя. На індывідуальных занятках найбольш таленавітыя з нас вучаць сольныя песні, у тым ліку для выканання на розных конкурсах. Напрыклад, зімой салют ад нашага калектыву ўдзельнічаў у міжнародным вакальным конкурсе «Шанец», даслаўшы відэа з выкананнем адной з песень рэпертуару "Гаманіны" пад акампанемент аркестра. Не так даўно стала вядома, што ён заняў першае месца ў катэгорыі "Народна-этнічныя спевы".

Ва ўсіх ёсць сваё месца, свая асаблівая роля ў сцэнары кожнай новай праграмы, і на індывідуальных рэпетыцыях гэтыя ролі даводзяцца да ідэалу. Калі праходзяць групавыя заняткі — як з удзелам аркестра, так і без яго — праграма праводзіцца ад пачатку да канца, і гэта, думаю, лепшыя моманты, таму што тады ўсе кавалачкі адзінага цэлага ўз'ядноўваюцца і пачынаюць гучаць гарманічна.

Мы вывучаем абрады, прысвечаныя кожнаму з этапаў гадавога цыкла, напрыклад, Каляды, Масленіца, валачобны абрад, Купалле. У студзені мы праводзілі выступ з каляднай праграмай, 6-га красавіка 2024 г. абаранілі званне народнага ансамбля, а хутка плануюцца яшчэ некалькі выступленняў. Кіраўніца калектыву Маслакова Вера іванаўна матэрыял для выступленняў збірае як са сваіх асабютых экспедыцый, так і з фальклорных зборнікаў, складзеных этнографамі і фалькларыстамі. Наш калядны сцэнар пабудаваны па галоўнай экспедыцыі 2019 года. Тады кіраўніца трапіла ў вёску Тонеж Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці, дзе збірала матэрыял па звычаях калядавання і шчадравання гомельскага Палесся, захоўваючы арыгінальнае гучанне і вымаўленне слоў для лепшай перадачы атмасферы рэальных абрадаў, якія праводзілюя нашымі продкамі. Вось адна з песень, якая была прывезена з экспедыцыі:

*"Ці дома, дома сам пан гаспадар"*
*Ці дома, дома сам пан гаспадар?*
*Шчодры вечор, сам пан гаспадар,*
*Шчодры вечор, святы Васілей!*
*Ой, нема, нема, у гоменцэ седзець,*
*У гоменцэ седзець, пшэнецу вее.*
*Ой, ходзем мамо дай памогамо,*
*Ці не дасць жэ нам хоць по веенцэ.*
*Ці дома, дома дай яго жона?*
*Ой, нема, нема, у пекарне седзець,*
*У пекарне седзець пірогі печэ.*
*Ой, ходзем мамо дай помогамо,*
*Ці не дасць жэ нам хоць по пірогу.*
*Ці дома, дома дай яго дачка?*
*Ой, нема, нема, ў хустарні седзіць,*
*У хустарні седзіць, хусты качаець.*
*Ой, ходзем мамо дай помогамо,*
*Ці не дасць жэ нам хоць по хустаццы.*

Улетку 2024 г. таксама плануецца фальклорная экспедыцыя поўным складам калектыву для збору купальскіх траецкіх песень на Полаччыне.

Такім чынам, захаванне і дэманстрацыя разнастайнасці дыялектаў на тэрыторыі Беларусі з'яўляюцца важнымі аспектамі ўзмацнення культурнай спадчыны і ідэнтычнасці народа. Кожны дыялект — гэта ўнікальны моўны феномен, які адлюстроўвае гісторыю, асаблівасці менталітэту і традыцыі насельніцтва пэўнай тэрыторыі. На сёння юнуе мноства дыялектаў і мясцовых варыянтаў беларускай мовы. Важна захаваць гэтую моўную мазаіку, якая з'яўляецца асновай для фарміравання культурнага самавызначэння краіны. Ансамбль народнай песні "Гаманіна" сваёй дзейнасцю спрыяе гэтаму, збіраючы і ўвасабляючы на сцэне бясцэнны вопыт пакаленняў, звязаны з беларускай нацыянальнай культурай. Такім чынам, ансамбль "Гаманіна", з'яўляючыся пляцоўкай для дэманстрацыі разнастайнасці нацыянальнай культуры і дыялектаў беларускай мовы, актыўна ўдзельнічае ў захаванні традыцыйнай народнай культуры Беларусі.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Лукашанец А.Г. Словаўтварэнне назоўнікаў у беларускіх сацыяльных дыялектах // А. Г. Лукашанец / Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Серыя 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. Псіхалогія. - Мінск : Універсітэцкае. - 1994. - № 2. - С. 47–50.*